

# КРЫНІЧКА

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”

Выпуск №6 (22)
Люты 2022

## У нумары:

| | |
|---|---|
| **У Міністэрстве адукацыі – новы Міністр адукацыі** | **Стар. 1** |
| **Віншуем пераможцаў!!!** | **Стар. 2** |
| **Дзень здароўя** | **Стар. 2** |
| **Міжнародны дзень роднай мовы** | **Стар. 3** |
| **З Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь!** | **Стар. 4** |
| **У школе прайшла прафілактычная акцыя “Сябруем з законам!”** | **Стар. 5-6** |

# У Міністэрстве адукацыі – новы Міністр адукацыі



10 лютага Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка назначыў Андрэя Іванца Міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Новы кіраўнік ведамства - вучоны, доктар хімічных навук, член-карэспандэнт, прафесар.

У 2006 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Сваю працоўную дзейнасць пачаў у Інстытуце агульнай і неарганічнай хіміі НАН Беларусі. У 2013 годзе стаў старшынёй Савета маладых вучоных НАН Беларусі.

З 2016 года працаваў на пасадзе намесніка дырэктара па навуковай рабоце Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі НАН Беларусі. У 2018 годзе Андрэй Іванец - прафесар Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі, а з 2019 года - Галоўны вучоны сакратар НАН Беларусі.

# Віншуем пераможцаў!!!



Віншуем вучаніц 7 класа Даўгаполаву Таццяну і Ярашэвіч Мар’яну, навучэнцаў аб'яднання па інтарэсах "Натхненне", з дыпломам II ступені за перамогу ў выставе-конкурсе "Лёд. Кветкі. Фантазія" ў намінацыі Ёлачная цацка "Новая старая казка"!

Кіраўнік аб'яднання па інтарэсах "Натхненне" - Налётка Марына Аляксандраўна.

Жадаем вучаніцам і іх кіраўніку новых творчых перамог!!!






# Дзень здароўя

12 лютага ў школе прайшоў Дзень здароўя. Вучні весела і з карысцю правялі шосты школьны дзень.







# Міжнародны дзень роднай мовы




Мова продкаў нашых і нашчадкаў –
Шэпт дубровы і пчаліны звон, –
Нам цябе ласкава і ашчадна
Спазнаваць ажно да склону дзён,
Па чужых краях не пабірацца,
Не аддаць цябе на забыццё,
Наша невычэрпнае багацце,
Наша несмяротнае жыццё.

Г.Бураўкін

Дзень роднай мовы асаблівы для кожнай нацыі, кожнага народа, бо няма народа без мовы, няма мовы без яго носьбіта. І мы, беларусы, не выключэнне. Нам у спадчыну засталася ўнікальная мова – жывая і мілагучная, песенная і паэтычная, старажытная і сучасная. З нагоды гэтага свята у школьной бібліятэцы на працягу ўсяго тыдня праходзіла выстаўка твораў беларускіх пісьменнікаў.






Вучні 5-9 класаў прынялі ўдзел у мерапрыемстве, прысвечаным Міжнароднаму дню роднай мовы.





У дзіцячым садку таксама прайшло мерапрыемства "Прыгажосць беларускай мовы", прысвечанае роднай мове.




# З Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь!




Штогод 23 лютага ў нашай краіне адзначаецца Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Гэта свята, устаноўленае Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №157 ад 26 сакавіка 1998 года, па праве лічыцца ўсенародным. Гэта дзень памяці мужнасці і гераізму ўсіх пакаленняў абаронцаў Айчыны, якія абаранілі незалежнасць роднай зямлі.

Цяпер ужо мала хто памятае, што гісторыя свята пачынаецца ў гады Першай сусветнай вайны. 23 лютага 1918 г. атрады Чырвонай гвардыі атрымалі свае першыя перамогі пад Псковам і Нарвай над рэгулярнымі войскамі кайзераўскай Германіі. У 1922 годзе гэта дата была афіцыйна аб'яўлена Днём Чырвонай Арміі. З 1946 года 23 лютага штогод адзначалася ў СССР як усенароднае свята - Дзень Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, а пасля распаду Савецкага Саюза быў перайменаваны ў Дзень абаронцы Айчыны.

Цяпер Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь сімвалізуе патрыятызм, вернасць воінскаму абавязку, гатоўнасць да самаахвяравання ў імя свабоды і незалежнасці Радзімы.

Па традыцыі ў гэты дзень прынята аддаваць даніну падзякі і павагі тым, хто мужна змагаўся, абараняючы Айчыну, і тым, на каго ў мірны час ускладзена нялёгкая і адказная служба па абароне Радзімы.





**Дарагія нашы мужчыны, віншуем вас з Днём абаронцаў Айчыны!**
**Жадаем Вам моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту,**
**невычэрпнай энергіі і аптымізму.**

# У школе прайшла прафілактычная акцыя “Сябруем з законам!”




У перыяд з 31 студзеня па 24 лютага ў школе праходзіла прафілактычная акцыя "Сябруем з законам!". У рамках гэтай акцыі для вучняў былі арганізаваны і праведзены шматлікія мерапрыемствы.

- класныя і інфармацыйныя гадзіны "Жыві ў бяспецы", "Вывучаем права з Дзіцячым прававым сайтам", "Помні, жыццё ў тваіх руках", "Пяць крокаў бяспекі" і інш.





- у 5-7 класах прайшлі заняткі Школы Актыўнага Грамадзяніна ў рамках тэматычнага блока "Я і грамадства": гадзіна цікавых паведамленняў "Ёсць такая прафесія - Радзіму абараняць" (5-6 класы), дыялог-спрэчка "Маладзёжныя субкультуры самавыяўленне або пратэст"







- конкурс малюнкаў "Я і закон", распрацоўка і распаўсюджванне памятак для бацькоў у выпадку крызіснай сітуацыі





- спаборніцтвы па шахматах і шашках











- школьная бібліятэка прадставіла кніжную выстаўку "Кожны ў праве ведаць аб праве", на якой увазе юных чытачоў была прадстаўлена літаратура аб тым, як павінен сябе паводзіць чалавек у грамадстве, што такое закон і чаму яго трэба выконваць. Бо важна не толькі самому выконваць закон, але і перашкаджаць яго парушэнню іншымі людзьмі. Ад гэтага залежыць жыццё і бяспека ўсяго чалавецтва.

Правядзенне акцыі «Сябруем з законам!» садзейнічала фарміраванню свядомых законапаслухмяных паводзін вучняў, развіццю духоўнай і маральнай культуры навучэнцаў, імкненню за здаровага ладу жыцця.

Рэдкалегія: вучні 5 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 5 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 31 сакавіка.